***14.10.2015***

# *ДНЮ МАЦІ*



**Ракавец Дзмітрый**

Матуля, матуля, прыгожая мая!
Найлепшая, найлепшая, чакаю цябе я.
Усмешкаю, усмешкаю развесяліш мяне.
Словамі, словамі распесціш ты мяне.
А едзеш ты з работы, стомленая мая,
А я цябе пешчу, прыгожая мая…

**********************************************************



**Ціхамірава Ганна**

***Маці***

Маці родная мая,
Ты ў мяне адна,
Даражэйшая за ўсіх
І найлепшая з усіх.

***Восень***

Восень залатая
Надышла да нас.
Жоўты ліст лятае,
Хораша ў нас.

***Арцімовіч Анастасія***

Лісце з галін ападае,
Як песня з дрэў злятае.
Вецер над борам бушуе,
Ён там заўсёды пануе.
Грыбнік пайшоў пералескамі,
Там грыб дзесьці пад лісцямі.
Як быццам у хованкі гуляе,
А чалавек яго шукае.
Лашчыцца сонца з вадою,
Лашчыцца лісцік з травою,
Як быццам у апошні раз
Сустрэліся перад зімою  ў нас.